www.gazeta.bsu.by

БДУ

# УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

4 красавіка 2007 года, № 6 (1957)

ВЕДАЙ НАШЫХ!

## МЫ – СЯРОД ЛЕПШЫХ У СВЕЦЕ!

***У сталіцы Японіі Токіо з 12 па 16 сакавіка 2007 г. прайшоў фінал чарговага 31-га каманднага Чэмпіянату свету па праграмаванні пад эгідай АСМ (Association of Computing Machinery).***

У яго адборачных турах стартавалі 6099 камандаў з 1756 універсітэтаў 82-х краін свету. У фінале прынялі ўдзел 88 калектываў. Найбольшае прадстаўніцтва – у ЗША (20 камандаў), Кітая (12) і Расіі (10).

Маладая каманда Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у склад якой увайшлі студэнты I–III курсаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі Мікіта Леснікоў, Уладзімір Керус і Павел Іржаўскі, упершыню выступіла на гэтым турніры і заняла вартае 26-е месца на заключным этапе спаборніцтваў. У верасні 2006 г. гэты калектыў заваяваў дыпломы трэцяй ступені ў 1/8 фіналу, які праводзіўся паралельна з адкрытай алімпіядай БДУ па праграмаванні. У пачатку лістапада 2006 г. нашы хлопцы перамаглі на чвэрцьфінальных спаборніцтвах сярод 49-ці команд Заходняга рэгіёну, куды ўвайшлі універсітэты Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі і Калінінграда. У канцы 2006 г. яны занялі 9-е месца сярод 196-ці каманд ВНУ, што прадстаўлялі краіны постсавецкай прасторы і атрымалі пуцёўку ў фінал.

На фінальным этапе чэмпіянату свету перад усімі ўдзельнікамі было пастаўлена 8 складаных задач. Рашыўшы 4 з іх, каманда БДУ не толькі ўвайшла ў спіс кваліфікаваных, але і здолела па выніках зраўняцца ці абысці прадстаўнікоў Стэнфардскага універсітэта, Каралеўскага тэхнічнага універсітэта Швецыі, Такійскага і Гарвардскага універсітэтаў і іншых элітных навучальных устаноў.

Абсалютным жа чэмпіёнам свету 2007 г. стала каманда Варшаўскага універсітэта (Польша), якая вырашыла ўсе задачы. Залатыя медалі таксама заваявалі каманды Tsinghua University (Кітай) за 2-е месца (7 задач), СПбДУ (Расія) – за 3-е і Massachusetts Institute of Technology (ЗША) – за 4-е месцы (па 6 задач абедзве).

Калектывы Беларускага дзяржаўнага універсітэта ўдзельнічаюць у гэтых прэстыжных спаборніцтвах з 1999 г. Кожная каманда можа прыняць удзел у чэмпіянаце не больш чым двойчы. На сённяшні момант у БДУ працягваюць вучыцца ўладальнікі залатых медалёў аналагічнага турніру 2004 г. – Вікторыя Лебедзь, Іван Мяцельскі і Максім Восіпаў. Многія іх старэйшыя таварышы, фіналісты папярэдніх гадоў, ужо скончылі універсітэт і паспяхова працуюць па выбранай спецыяльнасці.

**Валянціна КЛЯНІЦКАЯ**

КОНКУРСЫ

## ДАСКАНАЛАЯ ПРЫГАЖОСЦЬ – ЁСЦЬ!



***Конкурс "Ану, дзяўчаты! – 2007", які адбыўся 29 сакавіка ў ліцэі БДУ, стаў сапраўдным святам. Прадстаўніцы розных інтэрнатаў універсітэта дэманстравалі свае таленты, прывабнасць і фантазію ў спаборніцтве за тытул "Дзяўчына-дасканаласць", а ўдзячная публіка надзвычай актыўна і гучна падтрымлівала канкурсантак.***

Дзевяць прыгажунь змагаліся за сімпатыі журы падчас трох конкурсаў. "Візітоўка" – хвілінны расповед пра сябе – даў дзяўчатам магчымасць выявіць майстэрства дэкламацыі і ўменне цікава "падаць" сябе. "Творчы конкурс" раскрыў іншыя таленты кожнай удзельніцы: у спевах, танцах, разыгрыванні мініяцюры. Дамінавалі на сцэне нечаканыя рашэнні, грунтоўны падыход да гукавога афармлення, намаганні засвоіць усю прастору сцэны, схільнасць да "відовішчнасці" выступу і моцная камандная работа. Так, Алена Зелянко, якая адстойвала гонар інтэрната №1, прапанавала гледачам сцэну шахматнай гульні са Смерцю (творча апрацаваныя дыялогі з "Ладдзі Роспачы" Ул. Караткевіча на музыку Х. Цыммера з галівудскай стужкі "Скала"). Таццяна Курынская (інт. №6) запрашала паразважаць над праблемамі жаночай эмансіпацыі падчас размовы з Розай Люксембург ("Роза, навошта ты прапанавала мужчынам мільён за нараджэнне дзіцяці? Яны ж сапраўды спрабуюць зацяжарыць!.."). Аксана Ліцкевіч з "дзесяткі" змайстравала на сцэне свой сусвет пад назваю "Фарбы жыцця" – тут панавала французская музыка, жангліраваў вясёлы клоун і ажывалі сапсаваныя лялькі...



*Пераможцу конкурсу Кацярыну Лін узнагароджваюць члены журы Саша Варламаў і Юрый Сіверцаў*

Да трэцяга конкурсу – "Музычны кліп" – залу падрыхтаваў Георгій Калдун. Ён падужаўся з вядучым імпрэзы Сяргеем Дарафеевым у дасціпнасці, прыгадаў час уласнага навучання ў БДУ і праспяваў дзве песні. Сапраўдным конкурсам для залы стала выступленне Уладзіміра Басько, саліста гурта «Моцарт», які запрасіў усіх прысутных паспяваць акапэльна.

Калі дзяўчаты паспрабавалі сябе ў ролі рэжысёра музычнага кліпа, стварыўшы свой варыянт відэа на вядомыя песні, журы занялася падвядзеннем вынікаў. Абраць найярчэйшую з нашых зорак, пагадзіцеся, справа няўдзячная. Мабыць, таму кожная дзяўчына атрымала свой тытул, а разам з ім – шанец адчуць сябе пераможцай. "Дзяўчынай-чароўнасцю" была прызнана Настасся Русакова (інт. №3), "Дзяўчынай-марай" – Святлана Кутаманава (інт. №4), "Дзяўчынай з вокладкі" – Ганна Лук'яненка (інт. №7), "Дзяўчынай-загадкай" – Алена Зелянко. Сваім шармам усіх паланіла Іна Марчанка (інт. №2), самай крэатыўнай назвалі Марыну Машэўскую (інт. №9), самай стыльнай – Таццяну Курынскую. Аксана Ліцкевіч займела адразу дзве ўзнагароды – "Прыз глядацкіх сімпатый" і тытул "Дзяўчына-ўсмешка". Самая-самая – "Дзяўчына-дасканаласць" Кацярына Лін (інт. №5) зробіць прафесійнае партфоліа ў фотастудыі "Мега" і адправіцца ў вандроўку ў Кіеў. А яшчэ ўсе ўдзельніцы атрымалі калектыўную SIM-картку "БеСТ", кветкі, наборы касметыкі і іншыя падарункі ад спонсараў.

Кацярына не чакала перамогі, хаця і вельмі на яе спадзявалася: "Мы рыхтаваліся да конкурсу ўсім інтэрнатам – шукалі рэквізіт, людзей, час, каб усім сабрацца разам, нас гэта вельмі з'яднала". Галоўнае ў дасягненні поспеху, лічыць "Дзяўчына-дасканаласць", – гэта "верыць у сябе, цярпець непрыемнасці і не здавацца, калі з'яўляюцца цяжкасці". Важная і падтрымка залы: "Калі выходзіш на сцэну пад шквал апладысментаў, адчуваеш падтрымку сяброў – усмешка ўзнікае сама сабой і ўсё атрымоўваецца нават лепей, чым рэпеціравалі". Сваё жыццёвае крэда Кацярына спецыяльна сфармулявала для першага конкурсу: "Быць шчырай, не час сумаваць, ні кропелькі гора, ні ценю сумнення, ззяць быццам сонейка, радасць дарыць – дэвіз мой, у жыцці з ім няма паражэнняў!".

Арганізатарамі імпрэзы пры падтрымцы рэктарата выступілі Студгарадок і ліцэй БДУ, які шчыра расчыніў дзверы перад прыхільнікамі дзявочай прыгажосці.

**Маргарыта АЛЯШКЕВІЧ**
**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

**«АСНОЎНЫ ПРАДУКТ НАВУКІ – ЧАЛАВЕК, НАСЫЧАНЫ ВЕДАМІ»**

**З даклада прарэктара па навуковай рабоце Уладзіміра ПАНЬКОВА**

**Стар. 2**

**ТУГА ЗЯЛЁНАЯ ЦІ АРАНЖАВЫ НАСТРОЙ?**

**Парады па пераадоленні крызісных сітуацый**

**Стар. 4**

## ВЕСТКІ З РЭКТАРАТА

ЗАГАДАМ РЭКТАРА БДУ дэканам механіка-матэматычнага факультэта прызначаны прафесар Міхаіл Жураўкоў.

---

РЭКТАР БДУ прафесар Васіль Стражаў падпісаў загад аб размеркаванні паўнамоцтваў паміж кіраўніцтвам універсітэта.

---

ПЛАНЫ ПРЫЁМУ на бюджэтнае і платнае навучанне ў БДУ зацверджаны рэктарам на 2007 год.

---

ПРАТАКОЛ аб навукова-тэхнічным супрацоўніцтве паміж Белдзяржуніверсітэтам і універсітэтам г. Лейпцыга (ФРГ) падпісалі 30 сакавіка рэктар БДУ Васіль Стражаў і яго нямецкі калега Франц Хойзер. Гэта цырымонія завяршыла работу першага беларуска-германскага навуковага калёквіуму, у якім прынялі ўдзел дэлегацыя БДУ і кіраўнікі вучэбных і навуковых падраздзяленняў лейпцыгскага універсітэта.

---

НА БАЗЕ геаграфічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта з 29 па 30 сакавіка праходзіў злёт удзельнікаў рэспубліканскай краязнаўчай акцыі вучнёўскай моладзі "Жыву ў Беларусі і тым ганаруся". Мерапрыемства адкрываў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў.

---

САКРАТАРОМ ГА "БРСМ" БДУ абраны Віталь Рабцаў падчас III Справаздачна-выбарнай канферэнцыі гэтай арганізацыі, якая прайшла 27 сакавіка. Сёння колькасны склад ГА "БРСМ" БДУ налічвае 4563 чалавекі.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

З ПЕРШЫХ КРЫНІЦ

# «АСНОЎНЫ ПРАДУКТ НАВУКІ – ЧАЛАВЕК, НАСЫЧАНЫ ВЕДАМІ»

## З даклада прарэктара па навуковай рабоце Уладзіміра ПАНЬКОВА аб развіцці навукі ў БДУ за 2006 год

У сучасных умовах значна змяніліся патрабаванні да выкарыстання навуковага патэнцыялу ВНУ ў сферы павышэння канкурэнтаздольнасці навуковых распрацовак, а таксама непасрэднага ўдзелу ў рашэнні сацыяльна-эканамічных праблем дзяржавы. Неабходна адзначыць, што 25 верасня 2006 г. Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь быў зацверджаны Статут Беларускага дзяржаўнага універсітэта, паводле якога БДУ надаецца статус вядучай вышэйшай навучальнай установы ў нацыянальнай сістэме адукацыі. Гэтае афіцыйнае прызнанне значнасці БДУ падымае на якасна новы ўзровень адказнасць усіх структурных падраздзяленняў універсітэта за навуковую і інавацыйную дзейнасць. Цяпер мы проста абавязаны адпавядаць ролі лідэра ў навуковай сферы вышэйшай школы.

Мінулы, 2006 год характарызаваўся цэлым шэрагам асаблівасцяў:

– захаваннем праблем у нарматыўна-прававым забеспячэнні навукова-інавацыйнай дзейнасці і неадназначнасцю яе ацэнак;

– узмацненнем дзяржаўнага кантролю за вынікамі навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці;

– з'яўленнем шэрагу дакументаў, якія вызначаюць новыя ўмовы і парадак у сістэме падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі;

– перагружанасцю сістэмы кіравання навукай з-за неабходнасці вырашэння так званых "бягучых пытанняў" (Галоўным упраўленнем навукі за справаздачны год выканана больш за 1000 даручэнняў рознага ўзроўню).

Увогуле, у БДУ склалася дзейсная сістэма атрымання навуковай прадукцыі і існуюць механізмы рэалізацыі нашых распрацовак. Аднак нельга сказаць пра аптымальную арганізацыю навукова-інавацыйнага цыкла. Сапраўды, ёсць шэраг выдатных інавацыйных прапаноў у маштабах універсітэта і яго прадпрыемстваў, але мы яшчэ не можам сказаць, за рэдкім выключэннем, што нашы распрацоўкі ўкараняюцца ў асобных галінах вытворчасці. Хоць задачы ставяцца менавіта так. Зараз навуковыя работнікі, як ніколі, могуць разлічваць на дзяржаўную падтрымку. Безумоўна, навукоўцу важна адчуваць сваю запатрабаванасць і мець высокі прэстыж. Разам з тым, такая ўвага з боку грамадства накладвае і большую адказнасць. Настае момант ісціны: ці зможа навука даць вартыя прапановы для падтрымкі тэхнічнага прагрэсу ў краіне, паколькі стратэгічны курс дзяржавы – эканоміка, заснаваная на ведах. Што мы маем на сёння? Першае – гэта шырокі спектр навуковых даследаванняў, якія склаліся гістарычна ў нашай краіне. Наўрад ці Беларусь як незалежная дзяржава пачала б развіваць энергаёмістыя гіганты ў прамысловасці і весці шматвектарныя навуковыя даследаванні. Разгалінаваная тэматыка айчыннай навукі (асабліва распрацоўкі ВПК) была абумоўлена адпаведнымі заказамі СССР, якія дастаткова добра фінансаваліся. Страціўшы іх, мы засталіся адзін на адзін з праблемамі арганізацыі навукі ў асобнай невялікай краіне і вымушаны жыць адпаведна сродкам.

У сучасных умовах нельга арыентавацца на даследаванні адцягненага характару і ісці шырокім фронтам, як гэта было раней. Трэба прызнаць, што на сённяшні дзень асобныя праекты ў дзяржаўных праграмах не прыводзяць да практычных вынікаў. Тут бачыцца рэзерв для эканоміі сродкаў бюджэту і іх канцэнтрацыі на сапраўды неабходных для вытворчасці распрацоўках з рэальнымі бізнес-планамі. Гэта вельмі цяжкая задача – вызначыць, каго трэба падтрымаць. Няправільны бізнес-план прыводзіць да адмоўных вынікаў. Мабыць, яго павінны складаць спецыялісты, а не самі аўтары праектаў.

Адным з галоўных момантаў, які стрымлівае практычнае выкарыстанне нашых распрацовак, з'яўляецца нізкая ўспрымальнасць прадпрыемстваў да інавацыйных працэсаў. Гэтаму шкодзіць не толькі адсутнасць сродкаў, але і арыентацыя на ўнутраны рынак, недахоп ведаў пра навукова-тэхнічныя навацыі, адсутнасць альтэрнатыўных спосабаў прасоўвання на рынак. Наш удзел у гэтай сферы не малазначны. Усе згаданыя праблемы нельга рашыць без перагляду сістэмы падрыхтоўкі адпаведных кадраў. Толькі плеяда маладых менеджэраў з новым мысленнем здолее выправіць сітуацыю.




Дарэчы, нягледзячы на вялікія сродкі, якія накіроўваюцца на Захадзе ў фундаментальную навуку, сёння ў свеце назіраецца дэфіцыт ідэй. У такіх умовах могуць цаніцца і прыносіць дывідэнды нашы традыцыйныя здабыткі. У першую чаргу, гэта высокі інтэлектуальны патэнцыял навукоўцаў, высокакваліфікаваныя кадры, адукаванасць і інтэлект нашай нацыі, у тым ліку і маладога пакалення. Трэба толькі знаходзіць механізмы правільнага выкарыстання гэтага рэсурсу. Фундаментальная навука дарагая, але ў той жа час яна адкрытая, інтэрнацыянальная. Ва ўмовах адзінай інфармацыйнай прасторы наша краіна можа карыстацца сусветнымі дасягненнямі без істотных выдаткаў. Для гэтага трэба пабудаваць сістэму, якая будзе стымуляваць навуковых работнікаў, адсочваць дасягненні сусветнай навукі праз глабальную сетку, карыстацца міжнароднымі сувязямі. Сёння можна сцвярджаць, што фундаментальнай навукі няма без міжнароднага супрацоўніцтва і міжнародных праектаў. Яшчэ адзін важны момант: навука – гэта наша разуменне жыцця, руху грамадства і нацыянальных інтарэсаў. З гэтай прычыны неабходна развіваць гуманітарны сектар фундаментальных навук. Амаль ва ўсім свеце, тым больш у маладых краінах, станаўленне сапраўднай фундаментальнай навукі адбывалася даволі эфектыўным спосабам – ва універсітэтах. Хоць лічыцца, што асноўны прадукт навукі – новыя веды, аднак у рэальнасці ім з'яўляецца чалавек, насычаны гэтымі ведамі – студэнты, магістранты, кандыдаты навук.

У 2006 г. БДУ пачаў выкананне заданняў Дзяржаўных праграм фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў на 2006–2007 гг. у адпаведнасці з прыярытэтнымі напрамкамі навукова-тэхнічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь.

Наш універсітэт з'яўляецца галоўным выканаўцай васьмі дзяржаўных комплексных праграм навуковых даследаванняў, трох дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў, чатырох дзяржаўных праграм арыентаваных фундаментальных даследаванняў, адной дзяржаўнай, дзвюх дзяржаўных навукова-тэхнічных і адной галіновай навукова-тэхнічнай праграм. Фінансавыя сродкі навуковай і навукова-тэхнічнай сферы комплексу БДУ ў 2006 г. склалі 46,7 млрд рублёў, выдаткі на выкананне навуковых даследаванняў – 30, 3 млрд рублёў.




У мінулым годзе выйшла 954 навуковыя выданні, з якіх 114 манаграфій, 511 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў (у тым ліку 269 афіцыйна зацверджаных у якасці дадзенага віду выдання), 49 зборнікаў навуковых прац, 172 зборнікі тэзісаў дакладаў на канферэнцыях.

Супрацоўнікі БДУ апублікавалі 4409 артыкулаў і 2333 тэзісы навуковых канферэнцый. Хочацца адзначыць і высокую колькасць публікацый з удзелам студэнтаў. Праведзены аналіз імпакт-фактараў замежных публікацый навуковых інстытутаў і цэнтраў паказаў, што навуковыя даследаванні ў БДУ праводзяцца на высокім узроўні і іх вынікі публікуюцца ў выданнях, якія маюць значную вагу ў сусветным навуковым грамадстве. Разам з тым, колькасць такіх публікацый невялікая.

На базе БДУ ў 2006 г. праведзена 104 навуковыя і навукова-практычныя мерапрыемствы (канферэнцыі, семінары, нарады і г.д.) рознага ўзроўню. Галоўным упраўленнем навукі распрацавана сістэма падтрымкі навуковых супрацоўнікаў па ўдзеле ў мерапрыемствах рознага ўзроўню. Так, для ўдзелу ў міжнародных канферэнцыях, сімпозіумах, семінарах, якія фінансуюцца дзяржавай у рамках міжнароднага навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, вучоным БДУ выдзяляецца матэрыяльная дапамога. У 2005–2006 гг. такую падтрымку атрымалі 235 прадстаўнікоў навуковых калектываў усіх падраздзяленняў БДУ на суму 165 млн рублёў.

У аспірантуры БДУ ў 2006 г. навучалася 738 чалавек, у тым ліку на дзённай форме – 439. Колькасць аспірантаў-замежнікаў павялічылася ў параўнанні з 2005 г. (24) і склала 37 чалавек. У 2006 г. аспірантуру закончылі 294 чалавекі. У тэрмін абаронена 24 дысертацыі. Такім чынам, працэнт своечасовай абароны дысертацый (эфектыўнасць аспірантуры) дасягнуў 13, 4 %.

Летась лідэрства універсітэта ў навукова-адукацыйнай сферы рэспублікі было замацавана загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, паводле якога на БДУ былі ўскладзены функцыі Рэспубліканскага метадычнага і інфармацыйна-аналітычнага цэнтра навукова-даследчай работы студэнтаў. Стварэнне ў рамках НДРС навуковага адзела ў значнай ступені садзейнічае паспяховай навуковай падрыхтоўцы ў аспірантуры. Адзначаецца рост колькасці студэнтаў універсітэта, якія прымаюць удзел у Рэспубліканскім конкурсе навуковых работ. Так, калі ў цэлым па краіне гэты рост склаў 9,4 %, то па БДУ – амаль 19 %. Аднак прынятае ў 2006 г. Вучоным саветам рашэнне, што тычыцца кіраўнікоў структурных падраздзяленняў, аб актывізацыі работы па падрыхтоўцы і вылучэнні навуковых работ на рэспубліканскі конкурс нельга лічыць выкананым цалкам. У параўнанні з мінулым годам знізілася эфектыўнасць удзелу студэнтаў БДУ ў конкурсе.

Галоўным упраўленнем па навуцы працягваецца работа ў сферы развіцця і актуалізацыі інфармацыйных рэсурсаў, якія забяспечваюць навукова-інавацыйную дзейнасць. У 2006 г. у БДУ былі зарэгістраваны 54 новыя распрацоўкі і актуалізавана інфармацыя па 88-мі назвах прадукцыі. Паводле даных на снежань 2006 г. база налічвае 268 запісаў. Атрымана і апрацавана каля 260-ці запытаў ад патэнцыяльных заказчыкаў. Запыты паступілі не толькі з Беларусі, але і з краін далёкага і блізкага замежжа.

У 2006 г. 28 найменняў новай навукова-тэхнічнай прадукцыі, распрацаванай у БДУ, атрымалі ўзнагароды на міжнародных інавацыйных конкурсах: адзін Гран-пры, восем залатых, восем срэбраных і тры бронзавых медалі, чатырнаццаць дыпломаў. Асобна трэба адзначыць IX Міжнародную выставу "Высокія тэхналогіі. Інавацыі. Інвестыцыі" (г. Санкт-Пецярбург), на якой з 51-го камплекта ўзнагарод распрацоўкі БДУ атрымалі пяць залатых і тры срэбраных медалі.

Міжнароднае навуковае і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва ў Беларускім дзяржаўным універсітэце адбываецца па трох асноўных напрамках: заключэнне і далейшая рэалізацыя пагадненняў аб супрацоўніцтве з замежнымі арганізацыямі, удзел у выкананні праграм і праектаў, якія фінансуюцца міжнароднымі фондамі і арганізацыямі, пастаўка навукова-тэхнічнай прадукцыі на экспарт.

Па стане на канец 2006 г. факультэты, навуковыя інстытуты і цэнтры БДУ супрацоўнічалі па 119-ці дамовах і пагадненнях з замежнымі адукацыйнымі і навукова-даследчымі ўстановамі, арганізацыямі з 30-ці краін і 2-х агульнаеўрапейскіх арганізацый (Еўрапейская Камісія, Навуковы Камітэт НАТА).

Як прыклад паспяховай работы адзначым актывізацыю ў 2006 г. навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва з Кітаем. Упершыню ў практыцы супрацоўніцтва Кітая і Беларусі быў пакладзены пачатак рэалізацыі сумесных праектаў. Адзін з іх – стварэнне сумеснай аспірантуры БДУ і Харбінскага універсітэта навукі і тэхнікі. У БДУ прыбыла першая група аспірантаў. У Хэйлунцзянскім інстытуце нафтахіміі адкрыты Цэнтр сумесных навуковых даследаванняў.

У выніку выканання 53-х кантрактаў і дамоваў з даследчымі цэнтрамі, інстытутамі, фірмамі і кампаніямі 14-ці краін, у тым ліку ранейшых кантрактаў, было фактычна зароблена валютных сродкаў на 1 млн 82 тыс. долараў.

Аналіз сучасных тэндэнцый сведчыць, што ад навукі чакаюць не толькі атрымання вынікаў, якія садзейнічаюць пашырэнню ведаў, але, перш за ўсё, яе істотнага ўплыву на навукова-тэхнічны прагрэс нашай краіны. З гэтай прычыны задача, якая павінна быць вырашана універсітэцкай навукай, складаецца з дзвюх частак: па-першае, традыцыйнае забеспячэнне педагагічнага працэсу вышэйшай адукацыі і падрыхтоўкі кадраў вышэйшай кваліфікацыі і, па-другое, рэалізацыя дзяржаўнай палітыкі па стварэнні, развіцці і актывізацыі навукова-інавацыйнай сферы рэспублікі.

УНІВЕРСІТЭТ

ВІНШУЕМ!

# У СУПЛЁЦЕ СУЧАСНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

***16 сакавіка Дзяржаўны інстытут кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ адзначыў 10 год сваёй дзейнасці.***

Гэта падзея стала нагодай для чыннага і вельмі цёплага святкавання ў ДК чыгуначнікаў, падчас якога ўзгадвалі бурнае мінулае ДзІКСТа, калі ўсё пачыналася з невялічкага спецыяльнага факультэта кіравання і сацыяльных тэхналогій. З таго часу гэта ўстанова імкліва развівалася і пашыралася. І да круглай даты інстытут падышоў як даволі разгалінаваная самастойная структура. Сфарміраваны універсітэцкія навуковыя школы ў галіне менеджменту, дызайну, сацыяльнай работы. На 8-мі інстытуцкіх кафедрах працуюць 150 выкладчыкаў, сярод якіх 16 дактароў і 86 кандыдатаў навук. На 6-ці спецыяльнасцях і 8-мі спецыялізацыях навучаюцца каля 2-х тысяч студэнтаў. Інстытут мае свае прадстаўніцтвы ў Гомелі і Віцебску, што дазваляе знаходзіцца ў больш шчыльным кантакце з завочнікамі.

З 2001 г. на базе ДзІКСТ праходзіць эксперымент з дыстанцыйным навучаннем. Тут шырока выкарыстоўваюцца інфармацыйныя тэхналогіі ў якасці электронных сродкаў перадачы адукацыйнай інфармацыі. Інстытут удзельнічаў у дзяржаўнай праграме інфарматызацыі "Электронная Беларусь". З дапамогай уласнага Цэнтра інфармацыйных тэхналогій у вучэбны працэс інтэгруюцца ўсе сучасныя навацыі, распрацоўваюцца электронныя вучэбныя модулі. Выдавецкім цэнтрам за ўвесь час падрыхтавана і выдадзена больш за 200 дапаможнікаў, вучэбна-метадычных і навуковых матэрыялаў.

Сярод усіх вучэбных падраздзяленняў універсітэта ДзІКСТ займае важнае месца.

На святочным сходзе рэктар Васіль Стражаў шчыра павіншаваў калектыў інстытута і ўручыў сямі яго супрацоўнікам ганаровыя граматы БДУ. Акрамя таго, асобныя выкладчыкі атрымалі ўзнагароды ад Міністэрства адукацыі: доктар гістарычных навук, прафесар Мікалай Ільінскі – знак "Выдатнік адукацыі", доктар медыцынскіх навук, прафесар Эдуард Збароўскі – ганаровую грамату. Пасля афіцыйнай часткі адбыўся канцэрт з удзелам зорак беларускай эстрады, а таксама творчых гуртоў студэнтаў і выкладчыкаў. Але гэтым дружны інстытуцкі калектыў не задаволіўся і зладзіў праз дзень дадатковае мерапрыемства ў клубе "Изюм".



*Былыя і цяперашнія кіраўнікі ДзІКСТа (злева направа): Сяргей Балашэнка, Уладзімір Булаўка, Пётр Брыгадзін і Зінаіда Валовіч*

Такая спрыяльная атмасфера дазваляе Дзяржаўнаму інстытуту кіравання і сацыяльных тэхналогій заставацца ў авангардзе адукацыйных працэсаў.

**Ганна ТОЛІНА**

СПАБОРНІЦТВЫ

# НАША КАРАТЭ-ДО – У ФАВОРЫ!

Напрыканцы лютага адбыўся адкрыты рэспубліканскі турнір па каратэ-до, прысвечаны памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў і Дню абаронцаў Айчыны, які сабраў прадстаўнікоў 52-х клубаў Беларусі і Расіі. Арганізаваны Беларускай федэрацыяй традыцыйнага каратэ-до ўжо ў пяты раз, ён набыў сапраўдную папулярнасць. Медалі, разыграныя ва ўсіх узроставых катэгорыях, маюць не меншую вартасць, чым заваяваныя на чэмпіянаце рэспублікі, а ў некаторых намінацыях канкурэнцыя нават больш сур'ёзная.



*Пераможца турніру Яўгенія Валянцейчык на трэніроўцы*

Гонар БДУ на гэтых спаборніцтвах абаранялі Віктар Стахоўскі, Арцём Казакевіч, Кірыл Есіпаў, Ігар Тавелеў, Ірына Альфер, Тамара Кабахідзе, Міхаіл Нічыпарук, Ганна Пракаповіч, Святлана Мацкевіч і Яўгенія Валянцейчык. Менавіта спрытныя дзяўчаты дасягнулі ўзнагарод: бронза ў індывідуальным ката (харэаграфічная кампазіцыя бойкі з некалькімі праціўнікамі) дасталася Святлане Мацкевіч, а золата ў кумітэ (паядынак) заваявала Яўгенія Валянцейчык.

Каманда БДУ бярэ ўдзел у згаданым турніры з 2004 года і ніколі не заставалася без медалёў. Поспех студэнтаў быў бы не магчымы без шматгадовай трэнерскай працы Аляксея Багданава (чэмпіён свету, майстар свету міжнароднага класа, 5 дан) і Леаніда Лушчыка (чэмпіён СССР, заслужаны трэнер Беларусі, 6 дан). Не дзіўна, што жадаючых займацца ў такіх прафесіяналаў заўсёды шмат. Трэніроўкі праводзяцца ў групах спортудасканалення і для пачаткоўцаў.

**Алеся ЧУМАКОВА**

**Фота Сяргея СТРАЛКОЎСКАГА**

## ГАРАЧАЯ ЛІНІЯ

***– Якія магчымасці для заняткаў спортам прапануе студэнтам і супрацоўнікам БДУ вучэбна-спартыўны комплекс "Універсітэцкі" па вул. Кастрычніцкай?***

– Як паведаміў дырэктар ВСК "Універсітэцкі" Уладзімір Чорны, на сёння ў комплексе дзейнічаюць усе спартыўныя залы (для гульнявых відаў спорту; для заняткаў барацьбой, цяжкай атлетыкай, лячэбнай фізкультурай, а таксама на трэнажорах). Акрамя таго, для паслуг супрацоўнікоў і студэнтаў – 25-метровы басейн з 3- і 5-метровымі вышкамі, а таксама аздараўленчы блок з парыльняй, утульныя раздзявальні і душавыя. За дзень спарткомплекс можа прыняць каля 1,5 тысяч чалавек. У хуткім часе плануецца закончыць рэканструкцыю стадыёна з футбольным полем, якое будзе мець спецыяльнае штучнае пакрыццё. Таксама прадугледжаны бегавыя дарожкі, трыбуны, электроннае табло і два санблокі. Для наведвання ВСК "Універсітэцкі" дастаткова падаць заяву ў адпаведныя прафкамы.

ВІНШУЕМ!

# СТУДЭНЦКАМУ САЮЗУ – 10 ГАДОЎ!

***24 і 25 сакавіка 2007 г. адбыўся выязны семінар-практыкум, прымеркаваны 10-годдзю Студэнцкага саюза БДУ. Мерапрыемства праходзіла на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу "Брыганціна".***

Студэнцкі саюз – арганізацыя, якая здзяйсняе сувязь паміж рэктаратам і студэнтамі, ладзіць агульнауніверсітэцкія мерапрыемствы, вядзе актыўную работу на факультэтах, накіраваную на раскрыццё творчага патэнцыялу таленавітай моладзі, пошук новых асоб. Менавіта гэта адзначыў рэктар універсітэта Васіль Стражаў на адкрыцці семінара.

На святкаванне былі запрошаны выпускнікі alma mater, якія раней уваходзілі ў склад Студэнцкага саюза, перш-наперш усе яго старшыні – Сяргей Дыесцераў, Аляксей Багамазаў, Тарас Даніленка, Юрый Глазко і Міхаіл Сіманюкоў. Кожны ў сваім выступленні адзначаў велізарны вопыт, атрыманы падчас работы ў Студсаюзе, даваў парады па яе ўдасканаленні.

Усяго ў мерапрыемстве прынялі ўдзел каля 70-ці чалавек. На семінары працавалі дзве секцыі: першая – "Узаемадзеянне студэнцкіх арганізацый у ВНУ", дзе прадстаўнікам усіх маладзёжных структур прапаноўвалася падрыхтаваць візітоўку іншай арганізацыі; другая – дыскусійны клуб "Выпускнікі". Гутарка атрымалася настолькі захапляльнай, што ўсе прысутныя спазніліся на трэнінг псіхалагічнай службы па камандаўтварэнні.

На наступны дзень прайшлі спартыўныя спаборніцтвы паміж студэнтамі і выпускнікамі, а таксама былі падведзены вынікі семінара.

**Таццяна РАДЗЮК**

НАВІНЫ СТУДГАРАДКА

Каардынацыйны савет студэнцкіх саветаў інтэрнатаў БДУ яшчэ ў мінулым годзе ўсталяваў добрую традыцыю – наведвацца з падарункамі і канцэртамі да дзяцей у розныя школы-інтэрнаты нашай краіны. Нагадаем, што першы візіт адбыўся ў лістападзе 2006 года ў Слуцк. 21 сакавіка студэнты працягнулі акцыю "Годнае дзяцінства" ў школе-інтэрнаце горада Смаргонь, дзе для падлеткаў-выхаванцаў наладзілі гульні, падзяліліся досведам наконт паступлення ў ВНУ, паказалі святочны канцэрт і, зразумела, уручылі падарункі – сшыткі, альбомы, энцыклапедыі, дыскі з дакументальнымі фільмамі і дамовіліся аб новай сустрэчы – ужо ў БДУ.

***

З 27 сакавіка па 5 красавіка ў інтэрнатах БДУ адбываецца справаздачна-выбарная кампанія, падчас якой будуць падведзены вынікі дзейнасці органаў студэнцкага самакіравання за мінулы год і выбраны новыя саставы студэнцкіх саветаў інтэрнатаў. Традыцыйна для новых актывістаў 27–29 красавіка будзе арганізаваны выязны семінар-практыкум "Школа студэнцкага актыву" на базе САК "Брыганціна".

***

Конкурс "Студэнцкі лідэр года" стартаваў 2 красавіка. У ім прымуць удзел прадстаўнікі органаў студэнцкага самакіравання Студгарадка, жыхары інтэрнатаў БДУ, грамадскія актывісты. Мэта акцыі – фарміраванне пазітыўнага іміджу лідэраў студэнцкага самакіравання БДУ і стымуляванне сацыяльнай актыўнасці студэнтаў. Мяркуецца правесці 3 этапы: першы – выбарчы, другі – завочны і фінал. Апошні этап конкурсу і падвядзенне вынікаў адбудуцца ў канцы красавіка ў рамках "Школы студэнцкага актыву".

**Паводле інфармацыі Студгарадка**




**Перамога студэнтаў юрыдычнага факультэта БДУ ў рэспубліканскай алімпіядзе па правазнаўстве** – "Рэспубліка" (17.03); "Настаўніцкая газета" (17.03).

**Экспрэс-тэсты на наркатычную залежнасць, створаныя вучонымі БДУ** – "Минский курьер" (17.03).

**Выстава лялек у музеі беларускай народнай культуры на філалагічным факультэце БДУ** – "Вечерний Минск" (20.03).

**Беларускі форум русістаў, адным з арганізатараў якога стаў філалагічны факультэт БДУ,** – "Беларусь сегодня" (22.03); "Літаратура і мастацтва" (23.03); "Знамя юности" (23.03).

**Пытанні, звязаныя з размеркаваннем студэнтаў БДУ** – "Звязда" (23.03).

**Скарачэнне бюджэтных месцаў у плане прыёму сёлетняй уступнай кампаніі ў БДУ** – "Экспресс-новости" (22.03).

**Пра Ігара Цімошчанку – выпускніка БДУ па спецыяльнасці "фізік-даследчык", які працуе на кафедры тэарэтычнай фізікі Белдзяржуніверсітэта і трэніруе вучняў 165-й сталічнай школы па фізіцы** – "Настаўніцкая газета" (24.03).

**Як праходзіць у БДУ профільны экзамен падчас уступнай кампаніі** – "Настаўніцкая газета" (27.03).

*Пра гэтыя і іншыя падзеі ў БДУ шырока паведамлялі ў сваіх матэрыялах інфармацыйныя агенцтвы, тэлеканалы, Беларускае радыё і FM-станцыі.*

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**

## АБ'ЯВЫ

**РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: інфармацыйных тэхналогій, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: неарганічнай хіміі, міжнародных адносін;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: тэарэтычнай фізікі, агульнай фізікі, аналітычнай хіміі, рускай мовы, рускай літаратуры, тэорыі літаратуры, класічнай філалогіі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, дызайну, інфармацыйных тэхналогій, агульнай і клінічнай псіхалогіі, крыніцазнаўства, фізічнага выхавання і спорту, культуралогіі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, паліталогіі, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: класічнай філалогіі, рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры, агульнай і клінічнай псіхалогіі, агульнанавуковых дысцыплін, англійскай мовы і моўнай камунікацыі, фізічнага выхавання і спорту, сучасных замежных моў, культуралогіі, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, міжнародных эканамічных адносін, раманскіх моў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, усходніх моў, міжнароднага турызму, эканамічнай тэорыі;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: класічнай філалогіі, нямецкага мовазнаўства, інфармацыйных тэхналогій, агульнанавуковых дысцыплін, псіхафізіялогіі, англійскай мовы гуманітарных факультэтаў, культуралогіі, сучасных замежных моў, англійскай мовы эканамічных спецыяльнасцяў, мытнай справы, міжнароднага права, англійскай мовы гуманітарных спецыяльнасцяў, эканамічнай тэорыі.

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220030, г. Мінск, вул.Бабруйская, 5а, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.**

**ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ КІРАВАННЯ І САЦЫЯЛЬНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ БДУ**

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад**

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:

- эканомікі і кіравання бізнесам (1);
- дзяржаўнага права (1).

**Тэрмін конкурсу – адзін месяц са дня апублікавання аб'явы.**

**Адрас: 220037, г. Мінск, вул. Батанічная, 15, аддзел кадраў, тэл. 210-01-10.**

**ДУА "РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ"**

**запрашае на павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўку ў красавіку–чэрвені 2007 г. выкладчыкаў і спецыялістаў устаноў адукацыі па наступных напрамках:**

метадалогія і методыка дысертацыйных даследаванняў (для маладых выкладчыкаў і навуковых супрацоўнікаў ВНУ) – 16.04–28.04;

студэнцкая моладзь і здаровы лад жыцця (для куратараў студэнцкіх груп, спецыялістаў па сацыяльнай і выхаваўчай рабоце) – 23.04–27.04, 21.05–25.05;

дзяржаўная палітыка ў сферы вышэйшай адукацыі (для прарэктараў, рэзерву прарэктараў, дэканаў ВНУ) – 14.05–19.05;

сістэмныя асновы інавацыйнай дзейнасці (для кіруючых работнікаў і спецыялістаў вышэйшай школы) – 14.05–26.05;

электронныя вучэбныя сродкі ў выкладанні дысцыплін сацыяльна-гуманітарнага цыклу: дыдактычны аспект (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, ПТВ, СШ) – 14.05–25.05;

асновы кіравання інтэлектуальнай уласнасцю (для прафесарска-выкладчыцкага саставу ВНУ, ССНУ) – 14.05–18.05;

методыка навучання асновам здаровага ладу жыцця (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) – 14.04–25.05;

актыўныя метады навучання ў вышэйшай школе (для выкладчыкаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ВНУ, ССНУ) – 28.05–08.06;

навуковыя асновы мадэлявання сацыяльных працэсаў у кантэксце выкладання сацыяльна-гуманітарных дысцыплін (для выкладчыкаў сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ВНУ, навуковых супрацоўнікаў і спецыялістаў сацыяльнага кіравання) – 04.06–16.06;

прафілактыка залежных паводзін ва ўстановах адукацыі (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ, СШ) – 11.06–22.06.

**Тэлефоны для папярэдняга запісу ў групы: 222-83-03, 200-20-47.**

**Наш адрас: 220007 г.Мінск, вул. Маскоўская, 15. РІВШ, каб.320, тел/факс 200-25-51.**

## КНІЖНАЯ ПАЛІЦА
# ВЫДАДЗЕНА Ў БДУ

*Альесевич Л.А.* **Элементы теории кривых.** У практыкуме прыводзяцца агульныя звесткі пра плоскія лініі, разглядаюцца некаторыя надзвычайныя лініі, падаюцца прыклады рашэння задач.

*Гусак А.А.* **Двойные интегралы.** У вучэбным дапаможніку змешчаны кароткія тэарэтычныя звесткі, прыклады рашэння задач, заданні для самастойнай работы і адказы да іх.

*Зажогин А.П.* **Атомный спектральный анализ.** У курсе лекцый выкладаюцца фізічныя асновы метадаў атамнага спектральнага аналізу, які прымяняецца сёння ў навуковых даследаваннях і на вытворчасці.

*Мощенская Л.Г.* **Русский язык: тематический контроль. История русского языка. Русская диалектология.** Дапаможнік прызначаны для выканання трэніровачных і праверачных работ па курсах "Гістарычная граматыка рускай мовы", "Гісторыя рускай літаратурнай мовы" і "Руская дыялекталогія".

**Структура географической среды и ландшафтное разнообразие Беларуси.**



У кнізе разглядаюцца праблемы фізіка-геаграфічнага раяніравання, ландшафтнай індыкацыі, ландшафтнай разнастайнасці і прыкладныя аспекты, звязаныя з аптымізацыяй прыроднага асяроддзя.

*Хведченя Л.В.* **Иностранный язык.** Праграма пабудавана паводле канцэпцыі развіцця асобы ў дыялогу культур: роднай і замежнай.

**Слушать – легко = Easy Listening.** У практычны дапаможнік уключаны аўтэнтычныя камунікатыўныя формулы, узоры англійскага маўлення.

**Современный русский язык. Синтаксис словосочетания и простого предложения.** У зборніку змешчаны практыкаванні, што тычацца сінтаксісу сучаснай рускай мовы.

**Упраўленне рэдакцыйна-выдавецкай работы БДУ**

## У ВОЛЬНЫ ЧАС

# ТУГА ЗЯЛЁНАЯ ЦІ АРАНЖАВЫ НАСТРОЙ?

***Кепскі настрой і паніжэнне жыццёвага тонусу адчуваюць раз-пораз усе людзі. Вось толькі адносіны да гэтага стану розныя. На жаль, нямногія вераць у тое, што сваім настроем сапраўды можна кіраваць. Калі мы бачым, як інвалід вядзе машыну ці маці пяцярых дзяцей паспяхова робіць кар'еру, то захапляемся сілай духу такіх людзей. Але не заўсёды пытаемся ў сябе: "Ці здолеў бы і я гэтаксама?" Нам падаецца, што гэта цуд альбо проста камусьці пашчасціла.***



Насамрэч нічога складанага тут няма. Трэба толькі выпрацаваць навыкі самакіравання падобна да навыкаў пісьма, чытання ці лічэння.

Н. Самавукіна ў сваёй кнізе "Псіхалогія аптымізму" дае наступныя рэкамендацыі тым, хто імкнецца саўладаць з прылівамі маркоты, суму, упадку сіл ці раздражнёнасці:

•"Звальваць" свой дрэнны настрой на іншых не трэба. Калі мы прызвычаімся паляпшаць яго праз канфлікт з іншым чалавекам ("пасварыўся – лягчэй стала"), навыкі самакіравання не выпрацуюцца. Другі чалавек выступае для нас у якасці своеасаблівай "мыліцы" – мы развучваемся хадзіць самастойна і ўвесь час хапаемся за гэтыя "падпоркі". Не гаворачы ўжо пра тое, што ён, прымаючы нашу "злую" энергію, слабее і нават можа захварэць...

•Не трэба "завісаць" на дрэнных думках і настроях, паддавацца "кальцавой логіцы" цяжкіх роздумаў. Паспрабуйце пашырыць сваю свядомасць, сваё бачанне свету. Часта можна пачуць: "Мяне ніхто не разумее, я больш не магу так жыць!" Людзі "накручваюць" сябе і перастаюць заўважаць тое добрае, што ёсць у жыцці. Азірніцеся – якое сонечнае, веснавое надвор'е стаіць за вакном, а побач з вамі сям'я і сябры, што заўсёды падтрымаюць, калі іх папрасіць... Прыглядзіцеся і вы абавязкова заўважыце вакол сябе тое, што зможа палепшыць настрой! Зрабіць яго, як лічаць псіхолагі, «аранжавым».

• "Зацыклівацца" – думаць увесь час пра адно і тое ж, пра штосьці гаротнае і цяжкае – безвыходная і непрадуктыўная стратэгія. У такім выпадку ўсё жыццё звужаецца і канцэнтруецца на адным: "Яна мяне пакінула...". І тады няма жыцця, а ёсць толькі адчай.

•Часцей прыгадвайце прымаўку "Пераначуем, болей пачуем" ці славутыя словы галоўнай гераіні рамана "Знесеныя ветрам": "Пра гэта я падумаю заўтра". А заўтра ўсё будзе ўжо па-іншаму і "пра гэта", можа быць, і думаць не прыйдзецца...

•І, канешне, шукаць і шукаць – сябе самога і тое добрае і светлае, што ёсць у жыцці кожнага з нас. Імкнуцца бачыць не парожнюю частку шклянкі, а яе другую палову, запоўненую вадой.

У кожнага чалавека ёсць свае спосабы змагання з прыгнечанасцю і дрэнным настроем. Напэўна, яны знойдуцца і ў вас. Пашукайце іх у сваім асабістым вопыце і трымайце заўсёды пры сабе. Можаце падзяліцца з іншымі, як "узяць сябе ў рукі".

Што ж перашкаджае нам быць шчаслівымі і заўважаць усё тое, што магло б размаляваць нашае жыццё яркімі фарбамі?

Іншым разам, калі чалавек доўгі час жыве ў прыгнечаным стане, узнікае ўнутраная звычка мець зніжаны тонус, мала радавацца жыццю ці не радавацца ўвогуле. Падтрымліваючы звыклы ўнутраны стан "сярэдняга дэпрэсіўнага цяжару", чалавек можа неўсвядомлена пазбягаць радасцяў і задавальненняў.

Другая прычына ў тым, што калі ў жыцці наступае станоўчы перыяд, чалавек можа адчуваць страх перад будучыняй: "Калі ўсё добра, робіцца вусцішна, бо наперадзе чакае «чорная паласа»". Такі страх – гэта звычка быць заклапочаным, прыгнечаным, не зусім шчаслівым.

Каб адолець пэўны стан, варта задумацца, у чым яго прычына. Упадак сіл – не заўсёды ўсвядомленая чалавекам патрэба у адпачынку. Калі зніжаны настрой цягнецца доўгі час, гэта можа сведчыць пра знаходжанне на мяжы нервовага зрыву ад пераратамлення. У такім выпадку трэба хоць на некалькі дзён зрабіць перадышку.

Магчыма, чалавек адчувае хандру і пастаянную стомленасць ад таго, што жыве не так, як павінен ці як хацеў бы. Палепшыць настрой і адчуць жыццёвую энергію ў гэтай сітуацыі дапаможа карэннае змяненне свайго жыцця.

Прыгнечаны настрой і дэпрэсія могуць з'явіцца, калі чалавек мае ярка выяўленыя здольнасці ў нейкай вобласці і не рэалізоўвае іх. Самавыяўленне – важная ўмова для псіхічнага здароўя неардынарнага і адоранага чалавека.

Стан "апусціў рукі" вельмі часта бывае першай рэакцыяй на сутыкненне з сур'ёзнай праблемай. Але калі чалавек пачынае змагацца за сябе, за сваю любімую справу, то былая актыўнасць праз некаторы час абавязкова да яго вяртаецца.

Жыццёвы тонус вяртае добры адпачынак. Вось некаторыя простыя, але дзейсныя рэкамендацыі, прапанаваныя Н. Самавукінай:

•На першым месцы па эфектыўнасці адпачынку стаіць фізічная нагрузка: заняткі спортам, прагулкі, выезды на прыроду, праца на дачы. Пры гэтым важна трошкі стаміцца, тады праходзіць дэпрэсія і раздражнёнасць прыкметна зніжаецца ці знікае зусім.

•Даволі часта людзі адзначаюць, што хутка супакоіцца і прывесці свае нервы "ў парадак" дапамагае вада і ўсё, што з ёю звязана: плаванне, ванна, душ, лазня, сауна.

•Добра, калі чалавек мае пэўнае захапленне ці хобі – яны дапамагаюць яму разняволіцца і атрымаць задавальненне. Станоўчыя эмоцыі і радасць эфектыўна кампенсуюць тое напружанне, якое даводзіцца перажываць на працы ці ў жыцці.

•У некаторых сілы хутка аднаўляюцца ў сям'і. Адчуванне сямейнага дабрабыту і надзейных адносінаў з блізкімі ахоўвае і падтрымлівае. Пачуццё, што ты не адзін ці не адна і што побач з табой людзі, якія зразумеюць і прымуць цябе, – напэўна, самае важнае для кожнага.

•Асабліва дабратворна ўздзейнічаюць стасункі з маленькімі дзецьмі. Паспрабуйце гадзіну-дзве пагуляць з малышом – стрэс як рукой здыме!

•Лёгка "скінуць" раздражнёнасць дапамагае звычайная гутарка са спакойнымі і аптымістычнымі людзьмі, прычым не абавязкова знаёмымі. Гэта можа быць выпадковы спадарожнік, прадавец на рынку ці прахожы.

•Многія любяць гуляць са свойскімі жывёламі. Заўважым, што нават пры непрацяглай размове пра любімых кошак і сабак людзі суцішваюцца і настройваюцца пазітыўна.

Якія з вышэйпералічаных заняткаў супакойваюць менавіта Вас? Што яшчэ дапамагае Вам хутка пазбавіцца раздражнёнасці і аднавіць унутраны баланс? Пашырайце ўласныя рэцэпты шчасця!

**Аксана ШАПАШНІКАВА,**
**педагог-псіхолаг**
**псіхалагічнай службы БДУ**

## ВЫСТАВЫ

# ЛЯЛЬКІ І ЖАНЧЫНЫ – НАЦЫЯНАЛЬНЫЯ МАТЫВЫ

**На філалагічным факультэце ў музеі беларускай народнай культуры 19 сакавіка адбылася выстава, на якой былі прадстаўлены лялькі ў нацыянальных жаночых касцюмах народаў розных краін. Шматлікія наведвальнікі маглі пазнаёміцца з традыцыямі, гісторыяй і асаблівасцямі адзення беларусак, украінак і расіянак, а таксама жыхарак Грэцыі, Кітая, Турцыі і Мальты. Акрамя таго, студэнткі БДУ з Беларусі і Непала прадэманстравалі сваю нацыянальную вопратку "ў жывую".**

Аснову дадзенай экспазіцыі склала ўласная калекцыя лялек загадчыцы музея прафесара Ірыны Казаковай, сабраных ёю падчас вандровак у многія краіны свету.

На пачатку дэманстраваліся традыцыі славянскіх народаў і асобны стэнд з айчынным жаночым убраннем. Далей была магчымасць апынуцца ў цудоўным свеце Кітая з яго адмысловай культурай. Цэнтральнае месца ў кампазіцыі займала незвычайная мініяцюра жанчыны з белым, як парцэляна, тварыкам. Як распавяла гід, шаснаццаць слаёў шоўку, з якога шылася адзенне кітаянак, могуць спыніць агнястрэльную кулю. А веерам, такім маленькім і вытанчаным, без якога ніводная кітаянка не з'яўлялася на людзях. Ці хто-небудзь задумваўся пра значэнне вузла на кімано? Гэта не толькі аздабленне, але і талісман, які ахоўвае душу. Выходзіць, што жанчыны проста так на сябе нічога не апранаюць. Нават вышыўка мае сэнс. Лотасы, якія ўпрыгожваюць тканіну, сімвалізуюць лета, півоні – вясну, а хрызантэмы – восень.

Убранне турэцкай жанчыны адрозніваецца неверагоднай колькасцю адзення, яе галава абавязкова пакрывалася або фераджай, або чадрой. Але гэта толькі для таго, каб схаваць сваю прыгажосць на вуліцы. А дома, перад сваім мужам, жанчына распускала валасы, апранала строй з празрыстай тканіны, упрыгожвала сябе золатам.

Майя Вайдзья, студэнтка V курса факультэта міжнародных адносін, распавяла пра непальскі жаночы строй – сары. Мне нават давялося апрануць яго. Уявіце, сем з паловай метраў пералівістай тканіны (раней даўжыня палатна дасягала дваццаці пяці метраў) ахутваюць стан і прыгожа спадаюць да самай падлогі. Менавіта ў такім вясельным строі дзяўчына мусіла з'явіцца перад сваім мужам. І як тут не закахацца?!



*Загадчыца музея Ірына Казакова разам са студэнткамі-мадэлямі*

Акрамя таго, з вуснаў няўрымслівага гіда можна было даведацца, чаму строй мальтыйкі нагадвае адзенне каталіцкай манашкі, калі ўпершыню руская жанчына апранула сарафан, што сімвалізуе яго форма, а таксама ўзоры на фартуху і вышыўка на сарочцы і шмат іншых захапляльных рэчаў. Усе наведвальнікі атрымалі сапраўдную асалоду ад незвычайнай прыгажосці жанчын розных краін свету, якіх аб'ядноўвае вялікі дар – магчымасць дарыць жыццё.

**Лейла ІСМАІЛАВА**
**Фота Аляксандра СНАПКА**

## З УСМЕШКАЙ

Новая акцыя дэканата: "Набяры тры хвасты і атрымай кірзавыя боты".

***

Дысертацыя маладога аспіранта на тэму "Ухіленне ад праходжання вайсковай службы метадам імітацыі навуковай дзейнасці".

***

Аб'ява: "Сям'я з пяці студэнтаў найме пакой. Ці ложак. Ці куток ложка".

***

Нядаўна мне прыснілася: чытаю я лекцыю студэнтам. Прачынаюся. І што вы думаеце?! Насамрэч чытаю лекцыю!

***

Пытанне: "Ці можна жаніцца студэнту?"

Адказ: "Нельга!!! Калі будзе захапляцца жонкай – з'явяцца хвасты; калі будзе захапляцца вучобай – вырастуць рогі; а калі будзе захапляцца і жонкай, і вучобай – адкіне капыты".

***

– Скажыце, Ваш сын знайшоў сабе прыдатны пакой, каб пачаць вучыцца ва універсітэце?

– Ён лічыць, што знайшоў. Яго жыллё – у двух хвілінах хады ад піўной, у трох метрах ад яго сяброўкі і ў гадзіне язды ад універсітэта.

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны універсітэт
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

Газета зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне №149 ад 30 жніўня 2005 года

4 красавіка 2007 года
Падпісана да друку 03.04.2007 г.
Зак. 263. Тыраж 1500 экз.Ум. друк. арк. 1.
Надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ"
ЛП № 02330/0056850 ад 30.04.2004.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Юлія ЛІТВІНАВА
Камп'ютарная вёрстка Аляксандра САЛАМАХІНА
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Бабруйская, 7, п. 411, тэл. 209-53-45,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by